■ Да 90-годдзя пісьменніка

# Жыццёвая адысея Аляксея Карпюка



Аляксей Карпюк нарадзіўся 14 красавіка 1920 года ў вёсцы Страшава на Беласточчыне ў сялянскай сям'і. Пасля сямігодкі вучыўся ў польскай гімназіі ў Вільні, у Навагрудскім педагагічным вучылішчы. У пачатку вайны ўваходзіў у склад падпольнай дыверсійнай групы. Падчас адной з дыверсій на чыгунцы ў канцы 1942 года быў арыштаваны і адпраўлены ў беластоцкую турму, а адтуль – у канцлагер Штутгоф. Яму ўдалося ўцячы з палону і прыняць удзел у партызанскай барацьбе. У 1944 годзе стаў камандзірам партызанскага атрада імя К. Каліноўскага. Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў разам з часцямі Савецкай Арміі ўдзельнічаў у баях на тэрыторыі Польшчы і Германіі. Двойчы паранены.

У 1949 годзе Аляксей Карпюк скончыў аддзяленне англійскай мовы Гродзенскага педагагічнага інстытута. Працаваў загадчыкам Сапоцкінскага рана, дырэктарам Біскупіцкай сямігадовай школы Ваўкавыскага раёна.

У друку дэбютаваў у 1953 годзе аповесцю "У адным інстытуце", неўзабаве быў прыняты ў Саюз пісьменнікаў СССР. Выкладаў у Гродзенскім педінстытуце. З 1955-га па 1957 год працаваў у абласной газеце «Гродзенская праўда», пасля быў уласным карэспандэнтам газеты "Літаратура і мастацтва".

Скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве, быў сакратаром Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў БССР.

Аляксей Карпюк узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны І і ІІ ступені, медалямі і залатым крыжам польскага ордэна "Віртуці Мілітары". Заслужаны работнік культуры БССР. Лаўрэат Літаратурнай прэміі СП БССР імя І. Мележа. Міжнародны біяграфічны цэнтр у Кембрыджы (Англія) надаў А.Карпюку званне «Лепшы чалавек года» за 1992 г.

Памёр пісьменнік 14 ліпеня 1992 года.

**Аляксей КАРПЮК вядомы як аўтар кніг «Дзве сасны» (1958), «Данута» (1960), «Мая Гродзеншчына» (нарыс, 1960), «Пушчанская адысея» (1964), «След на зямлі: скарбы і здабыткі маёй Гродзеншчыны» (1972), «Вершалінскі рай» (1974), «Ольга Корбут» (1977), «Свежая рыба» (1978), «Партрэт» (1983), «Сучасны канфлікт» (1985), «Дзве сястры» (казка, 1986), раман «Карані» (1988). Выйшлі выбраныя творы ў 2 тамах у 1980 г. і 1990-1991 гг.**

## Пісьменнік-партызан

У музеі гродзенскай СШ №35 адна з новых экспазіцый расказвае пра Аляксея Карпюка – былога кіраўніка партызанскага атрада імя Кастуся Каліноўскага, што дзейнічаў у беластоцкіх лясах.

Арганізатар музея, педагог з 46-гадовым стажам, Раіса Дзмітрыеўна Прохарава добра ведае біяграфію і творчасць пісьменніка Аляксея Карпюка. Некалі на яе прафесійны выбар і станаўленне вялікі ўплыў аказала маладая настаўніца Іна Анатольеўна Карпюк, жонка пісьменніка.

Калі ў школах быў аб'яўлены абласны конкурс на лепшую творчую работу пра педагогаў – удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, за цікавы пошук узялася дзесяцікласніца СШ №35 Насця Пачабыт. Пад кіраўніцтвам Раісы Дзмітрыеўны і з яе непасрэдным удзелам была праведзена вялікая пошукавая работа. Педагог і школьніца пабывалі ў архівах, музеях, у кватэры, дзе жыў пісьменнік. Шчыра адгукнулася дапамагчы ў пошуках дачка пісьменніка – Валянціна Аляксееўна Карпюк. Яна не толькі падзялілася цікавымі матэрыяламі, але і зрабіла станоўчы водгук на творчую работу школьніцы.

Рэферат атрымаўся змястоўным, са шматлікімі фотаздымкамі, дакументамі ваенных год. Кранаюць сэрца словы дзяўчынкі: «Я пазайздросціла тым людзям, з якімі Аляксей Карпюк быў побач, бо ад яго заўсёды ішло дабро, спагада, шчырасць. Пра такіх кажуць: чалавек вялікай душы».

## Аляксей Карпюк у маім жыцці

Некалі мне, вясковай дзяўчынцы-сямікласніцы, прапанавалі ў сельскай бібліятэцы невялічкую даволі «зачытаную» кніжку «У адным інстытуце». Тады я ўжо ведала, што аўтар Аляксей Карпюк – наш зямляк, вучыўся ў педінстытуце, і ўсе, аб чым апавядаецца ў творы, адбывалася ў Гродна. Пасля набыткам майго чытальніцкага вопыту сталі яго іншыя аповесці….

Праз некалькі год у маю Луцкаўлянскую сярэднюю школу завіталі даволі вядомыя ў тыя гады пісьменнікі Васіль Быкаў і Аляксей Карпюк. Яны цікава расказвалі пра герояў сваіх твораў, успаміналі мінулае, дзяліліся планамі. Тады нехта з настаўнікаў пахваліўся, што ў нашай школе таксама падрастаюць таленты. Незадоўга да гэтага выпадку я даволі ўдала выступіла на абласным конкурсе маладых паэтаў, актыўна друкавалася ў раённай газеце. Мяне папрасілі пачытаць свае вершы. Памятаю, як хвалявалася, як дрыжаў голас. Затое якой асалодай былі трохі жартаўлівыя, але па-бацькоўску лагодныя словы Аляксея Карпюка: «Гэта дзяўчынка, Васіль, некалі нас з табою пераплюне…»

Прайшлі гады, не лепшыя, на вялікі жаль, у жыцці пісьменніка. Памятаю, у верасні 1989 года Аляксей Карпюк узначальваў абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў. Яго рабочы кабінет размяшчаўся ў доміку Элізы Ажэшкі. Наша рэспубліка рыхтавалася да 50-годдзя ўз'яднання з заходнімі абласцямі, і мне было даручана падрыхтаваць матэрыял на гэту тэму. Я пайшла на сустрэчу з Аляксеем Карпюком, бо ведала, што ён быў сталым сведкай тых падзей. На развітанне не стрымалася і нагадала пісьменніку пра тую вясковую школьніцу, якая чытала некалі свае вершы. Маўляў, вас, паважаны Аляксей Нічыпаравіч, я так і не пераплюнула, не атрымалася з мяне сталага паэта, а вось у Саюз журналістаў СССР прынялі.

На памяць аб сустрэчы пісьменнік падпісаў мне адну са сваіх кніжак. А неўзабаве ўбачыў свет яго новы твор – раман «Карані». Як я насілася з ім, расказваючы ўсім знаёмым, што гэта новая кніжка апавядае пра жыццё такіх знаёмых і дарагіх сэрцу вёсак Прынёмання.

Мінулай восенню, роўна праз дваццаць год пасля апошняй сустрэчы з пісьменнікам, я збірала матэрыялы аб жыцці і творчасці Аляксея Карпюка для музея роднай школы. Перагарнула старонкі яго кніг, пабывала ў кватэры пісьменніка, гутарыла з яго дачкой Валянцінай, якая беражліва захоўвае ўсё, што звязана з памяццю аб бацьку.

Святлана МУРЫНА